**Бірукоў, В.** Страты, раны, боль Афганістана / В. Бірукоў // Наша Талачыншчына. – 2017. – 18 лют. – С. 2.

## СТРАТЫ, РАНЫ, БОЛЬ АФГАНІСТАНА

*Сонечны лютаўскі ранак, а на календары смутная дата, у сэрцы журботныя пачуцці. Прайшло 28 год, а з памяці не выходзіць, што страцілі мы ў той далёкам ад нас краіне, хвалюе, не дае супакою душы кожнай матулі, чаму трагічны лёс не абышоў менавіта яе сыночка.*

У гэты дзень ужо шмат год з жаданнем разам з прадстаўнікамі райвыканкама, Серкавіцкага і Коханаўскага сельвыканкамаў, ваенкамата мы наведваем магілы загінуўшых нашых землякоў у Афганістане. З жаданнем таму, каб падтрымаць па-чалавечы, па грамадзянскім абавязку іх матуль. гэтых гераічных столькі перажыўшых жанчын.

Шмат сваіх родных з палёў вайны з фашыстамі не дачакалася Лідзія Цітаўна Шастакова з вёскі Курчэўская Усвейка. Цяжка іх сям’я залечвала незагойныя раны, нацярпелася і яна, дзіця вайны. Думалася, што гэта апошняе такое жудаснае для іх выпрабаванне. Не маглі не нарадавацца з мужам, якім добрым, чулым і працавітым вырастае сын Валодзя. З адкрытай душою, чыстым сумленнем.Такім яго успрынялі і на заводзе «Ударнік» у Мінску, куды ён прыйшоў у 1983 годзе працаваць токарам. 24 красавіка 1983 года Уладзіміра з завода праводзяць на службу ў дэсантныя войскі. Трапляе ў Афганістан і за некалькі дзён да завяршэння службы гіне ад рук маджахедаў. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

– Быў бы сын жывы, – гаворыць Лідзія Цітаўна, – толькі і глядзела б на яго. А ўзамен, ды ці ж можна гэтым замяніць, толькі Валодзеў партрэт...

– У Вялікую Айчынную вайну, – заўважыў намеснік раённага ваеннага камісара Валянцін Сяргеевіч Барысаў, – гэты ордэн прыраўноўвалі да Зоркі Героя Савецкага Саюза.

Такой высокай узнагародай адзначаны і прымаўшы ўдзел у наведванні магіл загінуўшых Сяргей Мікалаевіч Шастак. Дарэчы, матулі воінаў-афганцаў на Талачыншчыне, дзеці якіх загінулі, падтрымліваюць адна адну. Гора іх звялі разам яго лягчэй пераносіць.

У гэтым пераканала сустрэча ў вёсцы Равяцічы з Нінай Аляксандраўнай Караткевіч.

Віктар быў для бацькоў гонарам, гвардыі яфрэйтар. Загінуў у 20 год, іх апора і падтрымка, настрой і планы на жыццё. Яго абарвала вайна на самым узлёце.

У гэты дзень яны стараюцца не паказваць свае горыч і боль. Мудрыя, пазнаўшыя гора з малых год яны двойчы перажылі вайну. У адну самі былі дзецьмі, у другую страцілі ўжо сваіх дзяцей. Шчырая людская падтрымка дае ім сілы жыць. Гэта дзякуючы іх сынам, мы жывём, страчаем вёсны, працуем. Але заўжды памятаем, якую цану за гэтае заплацілі іх сыны, гэтыя маладыя хлопцы, якое шчасце абарвалася ў іх асабіста, у іх матуль, родных і блізкіх. Мы ў вечным даўгу перад імі. Есць віна кожнагаз нас, што мы іх не зберагглі.

Слёзы маці, туга і шчымленне,
І чаканне, заўжды чаканне.
Ад думак няма збавення
Ў цёмнай ночы і светлым ранні.

Дзе ні ідзеш — яго голас і вочы,
Каля дому, у садзе, у хаце…
Выядае душу смутак-горыч,
Хочацца з сынам абняцца.

І святлей, і больш лёгка
На сэрцы, калі разам з сынам.
Тое дрэва вырасла, стала гонкім,
Гэта яго дрэва, тут яго сцяжына.

Тут яго неба, яго крыніцы,
Яго пяшчота і любоў.
Прыпадае матуля нізенька ніцма
Моўчкі да стаўшых святымі крыжоў.

***Віктар БІРУКОЎ***